# Пагадненне
# паміж
# Урадам Рэспублікі Беларусь
# і
# Урадам Украіны
# аб садзейнічанні і ўзаемнай ахове інвестыцый

Урад Рэспублікі Беларусь і Урад Украіны, у далейшым называюцца "Дагаворныя Бакі",

жадаючы ўмацаваць эканамічнае супрацоўніцтва на доўгатэрміновай аснове для ўзаемнай выгады абедзвюх Дзяржаў,

выказваючы намер стварыць і падтрымліваць спрыяльныя ўмовы для інвестараў аднаго Дагаворнага Боку на тэрыторыі іншага Дагаворнага Боку,

усведамляючы, што садзейнічанне і ўзаемная ахова інвестыцый згодна дадзенаму Пагадненню будуць стымуляваць дзелавую ініцыятыву ў гэтай галіне,

дамовіліся аб ніжэйпададзеным:

Артыкул 1
Азначэнні

Для мэт гэтага Пагаднення:

1. Тэрмін "інвестыцыі" азначае ўсе віды фінансавых і матэрыяльных сродкаў і іншых маёмасных і інтэлектуальных каштоўнасцей, якія былі інвесціраваны ў сувязі з эканамічнай дзейнасцю інвестараў - юрыдычных і фізічных асоб - аднаго Дагаворнага Боку на тэрыторыі іншага Дагаворнага Боку ў адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам апошняга і будзе ўключаць, у прыватнасці, але не выключна:

а) рухомую і нерухомую маёмасць, а таксама любыя іншыя рэчавыя правы, такія як правы залогавага ўтрымання, залогі, правы забяспячэння па пазыках і падобныя правы;

18

б) долі, акцыі, аблігацыі, пазыковыя абавязацельствы юрыдычных асоб, каштоўныя паперы і любыя іншыя формы ўдзелу ў кампаніях;

в) правы патрабавання ў адносінах да грашовых сродкаў або любога выканання абавязацельстваў, якія маюць эканамічную каштоўнасць і звязаныя з інвестыцыямі;

г) правы на інтэлектуальную ўласнасць, уключаючы аўтарскія правы, таварныя знакі, патэнты, прамысловыя ўзоры, тэхнічныя працэсы, “ноу-хау”, камерцыйныя сакрэты, фірменныя найменні і “гудвіл”, звязаныя з інвестыцыямі;

д) любое права на ажыццяўленне гаспадарчай дзейнасці, уключаючы правы на разведку, здабычу, развіццё і эксплуатацыю прыродных рэсурсаў.

Любая змена формы, у якой актывы былі інвесціраваны, не закранае яе характару як інвестыцый.

2. Тэрмін “інвестар” азначае любую фізічную або юрыдычную асобу, якая ажыццяўляе інвестыцыі на тэрыторыі іншага Дагаворнага Боку:

а) тэрмін “фізічная асоба” ў адносінах да любога з Дагаворных Бакоў азначае любую фізічную асобу, якая мае грамадзянства любога з Дагаворных Бакоў у адпаведнасці з яго заканадаўствам;

б) тэрмін “юрыдычная асоба” ў адносінах да любога з Дагаворных Бакоў азначае любую ўстанову, створаную ў адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам кожнага з Дагаворных Бакоў і, якая мае права ажыццяўляць інвестыцыі на тэрыторыі іншага Дагаворнага Боку.

3. Тэрмін “даходы” азначае грашовыя сумы, прадугледжаныя нацыянальным заканадаўствам і атрыманыя ў выніку інвестыцый і ўключае, у прыватнасці, але не выключна: даходы, працэнты, прырост капіталу, акцыі, дывідэнды, раялці і плату за паслугі.

4. Тэрмін “тэрыторыя” азначае ў адносінах да кожнага з Дагаворных Бакоў тэрыторыю, якая знаходзіцца пад яго суверэнітэтам, а таксама мора, марское дно і яго нетры, над якімі гэты Дагаворны Бок ажыццяўляе ў адпаведнасці з міжнародным правам, суверэнітэт, суверэнныя правы або юрысдыкцыю.

## Артыкул 2
## Сфера дзеяння гэтага Пагаднення

Умовы гэтага Пагаднення будуць распаўсюджвацца на ўсе інвестыцыі, ажыццёўленыя інвестарамі аднаго Дагаворнага Боку на тэрыторыі іншага Дагаворнага Боку ў адпаведнасці з дзеючым

заканадаўствам Дагаворнага Боку, на тэрыторыі якога ажыццяўляюцца інвестыцыі як да, так і пасля ўступлення ў дзеянне гэтага Пагаднення.

Палажэнні гэтага Пагаднення могуць быць зменены або дапоўнены па згодзе Дагаворных Бакоў.

Артыкул 3
Садзейнічанне і ахова інвестыцый

1. Кожны Дагаворны Бок будзе заахвочваць і ствараць спрыяльныя ўмовы для інвестараў іншага Дагаворнага Боку для ажыццяўлення інвестыцый на сваёй тэрыторыі і дапускаць такія інвестыцыі ў адпаведнасці з яго заканадаўствам.

2. Інвестыцыі інвестараў любога з Дагаворных Бакоў будуць карыстацца справядлівымі і роўнымі адносінамі і атрымаюць поўную ахову і бяспеку на тэрыторыі іншага Дагаворнага Боку.

Артыкул 4
Нацыянальны рэжым і рэжым найбольшага спрыяння

1. Кожны Дагаворны Бок на сваёй тэрыторыі прадаставіць інвестыцыям інвестараў іншага Дагаворнага Боку рэжым, які з'яўляецца справядлівым і роўным і не менш спрыяльным за той, які ён прадастаўляе інвестыцыям сваіх уласных інвестараў або інвестыцыям інвестараў любой трэцяй дзяржавы.

2. Кожны Дагаворны Бок на сваёй тэрыторыі прадаставіць інвестарам іншага Дагаворнага Боку ў адносінах да кіравання, падтрымання, выкарыстання, атрымання даходаў і распараджэння сваімі інвестыцыямі рэжым, які з'яўляецца справядлівым і роўным і не менш спрыяльным за той, які ён прадастаўляе свім уласным інвестарам або інвестарам любой трэцяй дзяржавы.

3. Палажэнні пунктаў 1 і 2 гэтага Артыкула не павінны быць вытлумачаны такім чынам, каб абавязываць адзін Дагаворны Бок распаўсюджываць на інвестараў іншага Дагаворнага Боку перавагі любога рэжыму, ільгот або прывілей, што вынікаюць з:

а) любога мытнага саюза, зоны вольнага гандлю, грашовага саюза або іншых падобных міжнародных пагадненняў, якія ўплываюць на інвестыцыйны рэжым супрацоўніцтва, або іншых форм рэгіянальнага супрацоўніцтва, удзельнікам якіх любы з Дагаворных Бакоў з'яўляецца або можа стаць;

б) любога міжнароднага пагаднення або дамоўленасці, якія адносяцца цалкам ці галоўным чынам да падаткаабкладання.

Артыкул 5
Пакрыццё страт

1. Калі інвестыцыі інвестараў любога з Дагаворных Бакоў нясуць страты ў выніку вайны, узброенага канфлікту, дзяржаўнага надзвычайнага становішча, перавароту, паўстання, змовы або іншых падобных падзей на тэрыторыі іншага Дагаворнага Боку, апошнім Дагаворным Бокам ім будзе прадастаўляцца у тым, што датычыцца аднаўлення маёмасці, пакрыцця страт, кампенсацыі або іншых відаў урэгулявання рэжым не менш спрыяльны за той, які апошні Дагаворны Бок прадастаўляе інвестарам любой трэцяй дзяржавы.

2. Без урону для ўмоў пункта 1 гэтага Артыкула інвестарам аднаго з Дагаворных Бакоў, якія ў любой з сітуацый, зазначаных у гэтым пункце, нясуць на тэрыторыі іншага Дагаворнага Боку страты ў выніку:

а) рэквізіцыі іх уласнасці сіламі або ўладамі апошняга;

б) знішчэння іх уласнасці сіламі або ўладамі апошняга пры тым, што гэта не было выклікана баявымі дзеяннямі або не было выклікана неабходнасцю становішча,

будзе прадастаўлена справядлівая і адэкватная кампенсацыя за страты, якія былі панесены ў выніку рэквізіцыі або ў выніку знішчэння ўласнасці. Плацяжы, якія вынікаюць, будуць пераводзіцца без абмежаванняў у свабодна канверсуемай валюце і без неабгрунтаванай затрымкі.

Артыкул 6
Экспрапрыяцыя

1. Інвестыцыі інвестараў любога з Дагаворных Бакоў не падлягаюць нацыяналізацыі, экспрапрыяцыі або іншым мерам, дзеянне якіх эквівалентна нацыяналізацыі або экспрапрыяцыі ( называюцца ў далейшым “экспрапрыяцыя”) на тэрыторыі іншага Дагаворнага Боку, інакш як у грамадскіх інтарэсах апошняга Дагаворнага Боку. Экспрапрыяцыя будзе ажыццяўляцца згодна з устаноўленым заканадаўствам парадкам апошняга Дагаворнага Боку на недыскрымінацыйнай аснове і будзе суправаджацца ўмовамі аб выплаце своечасовай, адэкватнай і эфектыўнай кампенсацыі. Сума кампенсацыі выплачваецца ў валюце, у якой інвестыцыі былі ажыццёўлены, або ў любой іншай валюце, прымальнай для інвестара, згодна з дзеючым заканадаўствам Дагаворнага Боку, на тэрыторыі якога мела месца экпрапрыяцыя, і будзе складаць рынкавую вартасць экспрапрыіраваных інвестыцый на момант, які непасрэдна папярэднічаў ажыццяўленню экспрапрыяцыі ці яе абнародаванню ў залежнасці ад таго, што адбылося раней. Кампенсацыя будзе ўключаць працэнт, налічаны на аснове стаўкі LIBOR з даты экспрапрыяцыі, выплачваецца без неабгрунтаванай затрымкі, павінна быць эфектыўна

ажыццявімай і будзе пераводзіцца без абмежаванняў у канверсуемай валюце.

2. Інвестар, які панёс страты, будзе мець права на аператыўны разгляд справы і аналіз ацэнкі адпаведных інвестыцый згодна з прынцыпамі, выкладзенымі ў гэтым Артыкуле, судовай або іншай незалежнай паўнамоцнай інстанцыяй экспрапрыіруючага Дагаворнага Боку.

3. У выпадку, калі Дагаворны Бок экспрапрыіруе інвестыцыі, ажыццёўленыя ў форме юрыдычнай асобы, створанай згодна з яго заканадаўствам, у якой інвестар іншага Дагаворнага Боку мае фінансавы удзел, кампенсацыя згодна з пунктам 1 гэтага Артыкула павінна выплачвацца інвестару іншага Дагаворнага Боку ў памеры, адпаведным яго фінансаваму ўдзелу ў гэтых інвестыцыях.

Артыкул 7
Пераводы

1. Дагаворныя Бакі будуць гарантаваць перавод плацяжоў, якія звязаны з інвестыцыямі і даходамі, згодна з дзеючым заканадаўствам Дагаворных Бакоў. Пераводы будуць ажыццяўляцца ў канверсуемай валюце, у якой інвестыцыі былі першапачаткова ажыццёўлены або, па згодзе інвестара, у іншай валюце без ніякіх абмежаванняў і неабгрунтаваных затрымак. Такія пераводы будуць уключаць, у прыватнасці, але не выключна:

а) капітал і дадатковыя грашовыя сумы для падтрымання ці павелічэння інвестыцый;
б) даходы, працэнты, дывідэнды і іншы бягучы даход;
в) плацяжы, якія ажыццяўляюцца ў адпаведнасці з крэдытнымі пагадненнямі, звязанымі з інвестыцыямі;
г) раялці і плату за паслугі;
д) выручкі ад продажу ці ліквідацыі інвестыцый;
ж) заробкі фізічных асоб, звязаныя з інвестыцыямі, у адпаведнасці з законамі і правіламі Дагаворнага Боку, на тэрыторыя якога інвестыцыі былі ажыццёўлены.

2. Для мэт гэтага Пагаднення будуць выкарыстоўвацца абменныя курсы, якія вызначаюцца згодна з заканадаўствам Дагаворнага Боку і якія з'яўляюцца сапраўднымі для бягучых пагадненняў на дату пераводу, калі Дагаворныя Бакі не дамовіліся аб іншым.

22

## Артыкул 8
## Субрагацыя

1. Калі Дагаворны Бок або яго ўпаўнаважаны пасрэднік ажыццяўляе плацёж сваім уласным інвестарам згодна з гарантыяй, якую ён прадаставіў у сувязі з інвестыцыямі на тэрыторыі іншага Дагаворнага Боку, апошні Дагаворны Бок прызнае:

а) перадачу згодна закону або законнаму пагадненню ў гэтай краіне якога-небудзь права або права патрабавання інвестара да першага Дагаворнага Бока або да яго ўпаўнаважанага пасрэдніка, так як і то,

б) што першы Дагаворны Бок або яго упаўнаважаны пасрэднік атрымаў права ў выніку субрагацыі карыстацца правамі і выстаўляць патрабаванні гэтага інвестара і возьме на сябе абавязацельствы, звязаныя з гэтай інвестыцыяй.

2. Атрыманыя ў выніку субрагацыі правы або патрабаванні не будуць выходзіць за межы правоў і патрабаванняў інвестара.

## Артыкул 9
## Спрэчкі паміж Дагаворным Бокам і інвестарам іншага Дагаворнага Боку

1. Любая спрэчка, якая можа ўзнікнуць паміж інвестарам аднаго Дагаворнага Боку і іншым Дагаворным Бокам у сувязі з інвестыцыямі на тэрыторыі гэтага Дагаворнага Боку, будзе вырашацца шляхам перамоў паміж бакамі ў спрэчцы.

2. Калі якая-небудзь спрэчка паміж інвестарам аднаго Дагаворнага Боку і іншым Дагаворным Бокам не можа быць вырашэна згаданым чынам на працягу шасці месяцаў з даты прад'яўлення пісьмовага паведамлення, інвестар атрымлівае права накіраваць гэту спрэчку па выбару:

а) у суд і/або арбітражны суд згодна з дзеючым заканадаўствам Дагаворнага Боку;

б) у Міжнародны цэнтр па ўрэгуляванні інвестыцыйных спрэчак (ІКСІД), створаны Вашынгтонскай канвенцыяй ад 18 сакавіка 1965 г. па ўрэгуляванні звязанных з інвестыцыямі спрэчак паміж дзяржавамі і грамадзянамі іншых дзяржаў; або

в) у арбітражны суд ad hoc, які, калі бакі ў спрэчцы не пагадзіліся на іншае, павінен быць створаны і дзейнічаць згодна з Арбітражным рэгламентам Камісіі Арганізацыі Аб'яднаных Нацый па праву міжнароднага гандлю (ЮНСІТРАЛ). Бакі ў спрэчцы могуць згадзіцца пісьмова змяніць правілы гэтага Рэгламента. Арбітражныя рашэнні будуць канчатковымі і абавязковымі для абодвух бакоў у спрэчцы.

Зазначаны ў пунктах 2(б) і 2(в) парадак урэгулявання спрэчак паміж інвестарам аднаго Дагаворнага Боку і іншым Дагаворным Бокам можа быць прадугледжаны да выкарыстання толькі пасля вырашэння ўнутрыдзяржаўных судовых працэдур.

## Артыкул 10
## Урэгуляванне спрэчак паміж Дагаворнымі Бакамі

1. Спрэчкі паміж Дагаворнымі Бакамі на падставе тлумачэння або прымянення гэтага Пагаднення павінны, па магчымасці, вырашацца шляхам узаемных кансультацый і перагавораў.

2. Калі вырашэнне такой спрэчкі зазначаным вышэй чынам немагчыма на працягу шасці месяцаў пасля яе пачатку, гэта спрэчка па хадайніцтву любога з Дагаворных Бакоў будзе перададзена ў Арбітражны Суд згодна з палажэннямі гэтага Артыкула.

3. Такі арбітражны суд будзе заснаваны для кожнага канкрэтнага выпадку наступным чынам. На працягу двух месяцаў з дня атрымання арбітражнага хадайніцтва кожны з Дагаворных Бакоў прызначыць па адным члене суда. Гэтыя два члены вызначаць затым грамадзяніна трэцяй дзяржавы, які і будзе прызначаны Старшынёй суда з узаемнай згоды Дагаворных Бакоў. Прызначэнне Старшыні павінна адбыцца не пазней за два месяцы з дня прызначэння астатніх двух членаў.

4. Калі неабходныя прызначэнні не былі праведзены ў зазначаныя ў пункце 3 гэтага Артыкула тэрміны і калі Дагаворныя Бакі не дамовіліся аб іншым, любы з Дагаворных Бакоў можа звярнуцца з просьбай аб правядзенні неабходных прызначэнняў да Старшыні Міжнароднага Суда. Калі Старшыня Міжнароднага Суда з'яўляецца грамадзянінам аднаго з Дагаворных Бакоў або ён не мае магчымасці ажыццявіць зазначаныя вышэй дзеянні па іншых прычынах, права ажыццяўлення неабходных прызначэнняў будзе прадастаўлена Віцэ-Старшыні Міжнароднага Суда. Калі Віцэ-Старшыня Міжнароднага Суда, у сваю чаргу, з'яўляецца грамадзянінам аднаго з Дагаворных Бакоў або ён не мае магчымасці ажыццявіць зазначаныя вышэй дзеянні, просьба аб правядзенні неабходных прызначэнняў будзе адрасавана наступнаму па старшынству члену Міжнароднага Суда, які не з'яўляецца грамадзянінам ні аднаго з Дагаворных Бакоў.

5. Арбітражны суд, які ствараецца згодна з гэтым Артыкулам, прымае рашэнні большасцю галасоў. Гэтыя рашэнні абавязковыя для абодвух Дагаворных Бакоў. Кожны з Дагаворных Бакоў нясе выдаткі прызначанага ім члена суда і выдаткі, звязаныя з яго ўдзелам у арбітражным судаводстве; выдаткі Старшыні і няўлічаныя выдаткі будуць падзелены пароўну паміж Дагаворнымі Бакамі. Суд, аднак, мае права сваім рашэннем устанавіць для аднаго з Дагаворных Бакоў большую частку выдаткаў, і гэта рашэнне будзе абавязковым для абодвух Дагаворных Бакоў. Суд сам вызначае рэгламент сваёй работы.

Артыкул 11
Прымяненне іншых правілаў

Калі ўнутранае заканадаўства аднаго з Дагаворных Бакоў або існуючыя ці ўзгодненыя ў будучым у дапаўненне да гэтага Пагаднення паміж Дагаворнымі Бакамі абавязацельствы ў адпаведнасці з міжнародным правам змяшчаюць агульныя ці спецыяльныя правілы, згодна з якімі інвестыцыі інвестараў іншага Дагаворнага Боку карыстаюцца рэжымам больш спрыяльным за той, што ўстанаўліваецца гэтым Пагадненнем, гэтыя правілы маюць перавагу ў адносінах да гэтага Пагаднення ў той частцы і пастолькі, у якой і пакольні яны больш спрыяльныя.

Артыкул 12
Уступленне ў сілу, тэрмін дзеяння і спыненне дзеяння

1. Дагаворныя Бакі згадзіліся часова прымяняць тыя палажэнні гэтага Пагаднення, якія не ўстанаўліваюць норм іншых за тыя, якія прадугледжаны дзеючым заканадаўствам кожнага з Дагаворных Бакоў з моманту падпісання гэтага Пагаднення.

2. Гэта Пагадненне канчаткова ўступіць у сілу з даты атрымання апошняга паведамлення аб выкананні кожным з Дагаворных Бакоў унутрыдзяржаўных працэдур, якія патрабуюцца для ўступлення ў сілу гэтага Пагаднення.

3. Пагадненне спыняе сваё дзеянне па сканчэнні дванаццаці месяцаў з даты пісьмовага паведамлення аднаго з Дагаворных Бакоў аб сваім намеры спыніць яго дзеянне.

4. Палажэнні гэтага Пагаднення пасля спынення яго дзеяння будуць прымяняцца да інвестыцый, ажыццёўленых, але не выкарыстаных за перыяд яго дзеяння.

ЗДЗЕЙСНЕНА ў г. Кіеве "14" снежня 1995 г. у двух сапраўдных экзэмплярах, кожны на беларускай, украінскай і рускай мовах, прычым усе тэксты маюць аднолькавую сілу. У выпадку разыходжанняў у тлумачэнні перавага будзе надавацца тэксту на рускай мове.

| За Урад Рэспублікі Беларусь | За Урад Украіны |
|---|---|